Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны Універсітэт»

Кафедра гісторыі і сацыяльных навук

УЗГОДНЕНА

Загадчык кафедры
к. гст. навук, дацэнт
С. Я. Новікаў
«_»_______ 20__г.

# ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

## Гісторыя беларускай дзяржаўнасці

Для спецыяльнасцей:
6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з указаннем моў)»
6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з указаннем моў)»
6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з указаннем моў)»
6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з указаннем мовы)»

Укладальнікі:
дацэнт кафедры гісторыі і сацыяльных навук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Грабянчук І. В.
дацэнт кафедры гісторыі і сацыяльных навук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Цымбал А. Г.

Свидетельство о государственной регистрации ИР
№ 1142334764 от 13.06.2023 г.

Доступ к интерактивному ресурсу по ссылке :
https://moodle.mslu.by/course/view.php?id=2214

Абмеркавана і зацверджана на пасяджэнні
Навукова-метадычнага савета МДЛУ
« » __________20__ г., пратакол № __

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Месца вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам яе вывучэння з'яўляюцца найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа. Вывучэнне дадзенай вучэбнай дысцыпліны арыентавана на фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб гістарычным мінулым і напрамках далейшага развіцця беларускай дзяржавы.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца складовай часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі перакладчыкаў, лінгвістаў, спецыялістаў па міжкультурнай камунікацыі, выкладчыкаў.

Тэматыка лекцыйных і семінарскіх заняткаў нясе ў сабе значны ідэйна-палітычных патэнцыял, застаючыся пры гэтым у межах акадэмічнай традыцыі.

У сістэме сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасцей 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з указаннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з указаннем моў)», 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з указаннем моў)», 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з указаннем мовы)» вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампаненту.

Мэтай дадзенага электроннага вучэбна-метадычнага комплекса (далей – ЭВМК) з'яўляецца павышэнне матывацыі, зацікаўленасці і пазнавальнай актыўнасці студэнтаў у вывучэнні гісторыі беларускай дзяржаўнасці, садзейнічанне фарміраванню ў іх абгрунтаванай патрыятычнай пазіцыі з дапамогай сродкаў інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Зыходзячы з мэты выцякаюць наступныя задачы вучэбнай дысцыпліны і ЭВМК:

– фарміраванне сістэмы ведаў аб гісторыя беларускай дзяржаўнасці і развіццё ўменняў асэнсоўваць падзеі і з'явы сучаснасці ў цеснай узаемасувязі мінулага, сучаснага і будучага;

– стварэнне ўстойлівага ўяўлення аб гістарычным шляху і мэтах далейшага развіцця беларускай дзяржавы;

– развіццё навыкаў аргументавана і дакладна фармуляваць сваю пазіцыю па актуальных пытаннях палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сфер.

ЭВМК «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» мае наступныя раздзелы:

1. Тэарэтычны раздзел, прадстаўлены кароткімі канспектамі лекцый і электроннымі прэзентацыямі.

2. Практычны раздзел, які ўключае планы семінарскіх заняткаў, метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы і правядзенні семінарскіх заняткаў, матэрыялы для самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне і

графікі самастойнай работы студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання, а таксама патрабаванні да афармлення акадэмічнага рэферата.

3. Раздзел кантролю ведаў, які змяшчае матэрыялы для бягучай і прамежкавай атэстацыі (заданні для кантролю па тэмах, тэставыя заданні, пытанні да экзамену).

4. Дапаможны раздзел, які ўключае змястоўную частку вучэбнай праграмы, прыкладныя тэматычныя планы дысцыпліны і вучэбна-метадычныя карты для ўсіх форм навучання, крытэрыі аналізу гістарычных крыніц і матэрыялаў, пералік навучальных выданняў, рэкамендаваных для вывучэння па вучэбнай дысцыпліне.

Вучэбна-метадычны комплекс можа быць выкарыстаны таксама для самастойнага вывучэння студэнтамі ў працэсе падрыхтоўкі да лекцыйных, семінарскіх заняткаў, а таксама да экзамену.

*Метадычныя рэкамендацыі студэнтам па выкарыстанні вучэбна-метадычнага комплексу.*

Вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» варта пачаць з вывучэння структуры вучэбна-метадычнага комплексу, азнаёміцца са зместам яго раздзелаў. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на агульную колькасць гадзін для вывучэння прадмета, суадносіны лекцыйных і семінарскіх заняткаў, аб'ём самастойнай працы. Дадзеная інфармацыя ўтрымліваецца ў прыкладных тэматычных планах для дзённай і завочнай форм навучання, якія размешчаны ў дапаможным раздзеле.

Наступны этап работы – азнаямленне з графікам самастойнай работы, бібліяграфічным спісам.

Працаваць з матэрыялам дысцыпліны неабходна ў храналагічнай паслядоўнасці: скласці кароткі план работы па кожнай тэме, вывучыць прапанаваны канспект лекцый у тэарэтычным раздзеле.

Вывучэнне кожнай тэмы варта завяршаць адказамі на тэставыя заданні, якія знаходзяцца ў раздзеле кантролю ведаў. Пасля адказаў на тэсты і пытанні для самакантролю можна пераходзіць да засваення зместу наступнай тэмы.

Калі ў працэсе вывучэння вучэбнага матэрыялу спатрэбіцца веданне якіх-небудзь структурных адзінак з папярэдніх тэм, рэкамендуецца спачатку паўтарыць іх.

У тых выпадках, калі тэма ўтрымлівае заданні для самастойнай працы, неабходна строга прытрымлівацца тэрмінаў, адведзеных для гэтага віду работ.

Жадаем поспехаў у вывучэнні гісторыі беларускай дзяржаўнасці!